ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Беларускі універсітэт

ВЫДАЕЦЦА З 1935 г.

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

ЧАЦВЕР 15 СНЕЖНЯ 1977 г.

№ 35 (1185)

Цана 2 кап.

## ПА БДУ ІНФАРМАЦЫЯ

**Шмат увагі ўдзяляе КІД факультэта прыкладной мамэматыкі ўмацаванню сяброўскіх сувязей са студэнтамі замежных краін, якія займаюцца ў БДУ. Тэматычныя вечары - сустрэчы сталі на ФПМ традыцыяй.**

— Кожная сустрэча — вялікая радасць для студэнтаў, асабліва для першакурснікаў,— гаворыць намеснік сакратара камітэта камсамола ФПМ па інтэррабоце Святлана Бойкіна,— і гэта зразумела. Каму не хочацца даведацца больш аб жыцці, вучобе сваіх равеснікаў з другіх краін, аб тых праблемах, якія іх хвалююць.

Нядаўна перад студэнтамі выступіў магістр факультэта інфармацыі Ягелонскага універсітэта Яцэк Курас. Ён расказаў, вырашэннем якіх навуковых праблем заняты зараз нашы польскія сябры.

Гасцямі КІДа былі таксама аспірант кафедры фізікі Мажэт Абдул Кадум (Іран), выпускнік ФПМ Іса Давары (Афганістан), стажоры філфака Ангеліка Ленц і Андрэа Амстроф (ГДР). Госці расказвалі аб сваёй краіне, аб умовах студэнцкага жыцця, аб маладзёжных арганізацыях і іх задачах.

**А. ВАСІЛЬЕВА, А. ЦЯРЭНЦЬЕВА.**

* * *

**Шмат студэнтаў займаецца на падрыхтоўчым факультэце нашага універсітэта. Яны вывучаюць рускую мову, знаёмяцца з жыццём савецкага народа, рыхтуюцца да далейшай вучобы ў вышэйшых навучальных установах СССР.**

Нядаўна на факультэце адбыўся конкурс на лепшую дэкламацыю вершаў. Пераможцы атрымалі права ўдзельнічаць у вечары паэзіі, які рыхтуецца дэканатам.

...Вершы былі розныя, але іх аб'ядноўвала тэма міру, дружбы, свабоды і шчасця для ўсіх людзей. Асабліва шмат было антываенных вершаў. «Чалавек нарадзіўся не для вайны, чалавек нарадзіўся для працы»,— звонка гучыць голас юнака з В'етнама Лі Хыу Фыок.

«Ні белых, ні жоўтых, ні чорных няма, ёсць браты ў агні барацьбы»,— гаворыць студэнт з Туніса Хабіб Гідаун.

Доўга ў зале гучалі вершы— вершы, якія заклікалі да барацьбы за мір. Словам паэзіі гаварыла моладзь планеты.

**І. ГАЎРЫЦКІ.**

* * *

**Вось ужо чацвёрты год існуе на юрыдычным факультэце БДУ кіналекторый па крыміналістыцы. Вядзе яго выкладчык кафедры крыміналістыкі Аляксандр Уладзіміравіч Багданаў. Добрай традыцыяй стала запрашаць удзельнічаць у пасяджэннях кіналекторыя вопытных следчых.**

Днямі адбылося першае ў гэтым навучальным годзе пасяджэнне кіналекторыя. У ім прыняў удзел выпускнік юрфака, намеснік пракурора Маскоўскага раёна Мінска Валянцін Емяльянавіч Грыгор'еў. Шмат цікавага са сваёй следчай практыкі расказаў ён будучым юрыстам. І аб рабоце следчых, і аб сваёй працы. Успомніў і пра сваю першую самастойную справу...

— У нашай рабоце даводзіцца прымяняць і логіку, і крыміналістыку, і іншыя навукі,— гаворыць Валянцін Емяльянавіч. Гэтыя словы былі адказам на пытанне студэнтаў: як дапамагае тэорыя ў практычнай рабоце? «Без тэорыі ні пракурор, ні следчы нічога не значаць»,— падкрэслівае ён.

Студэнты горача падзякавалі В. Е. Грыгор'еву за цікавую гутарку. Кіналекторый скончыўся дэманстрацыяй дакументальнага фільма «Па гарачых слядах».

**А. ПРАКАПЕНКАЎ.**

### Савецкая Канстытуцыя вачыма замежных студэнтаў

## ЗНАМЯНАЛЬНАЯ ПАДЗЕЯ

Прыняцце новай Канстытуцыі СССР— гэта знамянальная падзея ў жыцці не толькі людзей нашай шматнацыянальнай краіны, але і ўсяго прагрэсіўнага чалавецтва. Ансіла Каракура, студэнтка з Бурундзі, якая навучаецца на падрыхтоўчым факультэце БДУ, сказала:

— Новая Канстытуцыя СССР — гэта пацвярджэнне міралюбівай палітыкі Савецкай дзяржавы, яна дае гарантыю трывалага і непарушнага міру, свабоду і шчасце ўсім народам Савецкай краіны. Гэта падзея акрыляе народы развіваючыхся краін у іх барацьбе за свабоду і незалежнасць. Мяне асабліва ўсхвалявала II глава Канстытуцыі, артыкулы 39—59. Іх змест — гэта сама рэчаіснасць. Савецкія людзі валодаюць сацыяльна-эканамічнымі, палітычнымі і асабістымі правамі і свабодамі. Грамадзяне СССР маюць права на працу, на адпачынак, на ахову здароўя, свабодны выбар прафесіі, недатыкальнасць асобы.

Лячэнне і медыцынскае абслугоўванне бясплатнае, савецкія людзі здаровыя і працаздольныя, яны спакойныя за свой заўтрашні дзень.

У абмеркаванні новай Канстытуцыі Савецкага Саюза, якое адбылося на падрыхтоўчым факультэце, прыняў жывы ўдзел і Жыль Мабіка, студэнт з Конга. Ён звярнуў асаблівую ўвагу на главу, у якой раскрываецца змест знешняй палітыкі СССР. У артыкулах 28—30 гаворыцца аб тым, што ў СССР прапаганда вайны забаронена. Гэта прымушае людзей за мяжой не верыць антыкамуністычнай прапагандзе, якая крычыць аб «савецкай пагрозе». Савецкі Саюз ніколі не паднімаў і не падніме зброю супраць народаў іншых краін, сказаў Жыль Мабіка. Наадварот, СССР з'яўляецца гарачым барацьбітом за мір і справядлівасць на ўсёй зямлі. Пацвярджэннем гэтага з'яўляецца тая дапамога, якую аказвае СССР маёй краіне.

На працягу многіх вякоў маю краіну разрывалі на часткі французскія, амерыканскія і бельгійскія каланізатары. Яны бязлітасна прыгняталі кангалезскі народ, вывозілі з краіны яе багацці. Пасля вызвалення ад каланіяльнага прыгнёту наша краіна пайшла па новаму шляху.

Першай дзяржавай, якая прызнала новае Конга, якая працягнула яму руку дапамогі і дружбы, была Савецкая дзяржава. Пры актыўнай падтрымцы Савецкага Саюза ў нашай краіне будуюцца заводы, фабрыкі, бальніцы. Савецкія вучоныя выкладаюць у ВНУ Конга.

Падзяліўся сваімі ўражаннямі наконт новай Канстытуцыі СССР і Амакоэ Ама, студэнт з Тога:

— У Мінск я прыехаў нядаўна, у жніўні, але ўжо нядрэнна ведаю горад. З вялікім жаданнем ходзім на экскурсіі, бо яны дапамагаюць больш даведацца аб жыцці народа ў Савецкай краіне.

Калі я даведаўся, што ў СССР прынята новая Канстытуцыя, я паспяшыў купіць газету «Юманітэ» і ў ёй падрабязна прачытаў аб новай Канстытуцыі СССР. І я зразумеў: Асноўны Закон Савецкага Саюза прынясе вялікую карысць барацьбе за светлую будучыню народаў, за мір і свабоду ва ўсім свеце. У тым, што мы пастаянна адчуваем на сабе нястомны клопат савецкіх выкладчыкаў і студэнтаў, мы бачым практычную рэалізацыю асноўных палажэнняў Канстытуцыі.

А. ГАРАЎСКАЯ.

### Рэха працоўнага семестра

**Заўтра, 16 снежня, адбудзецца абласны злёт студэнцкіх будаўнічых атрадаў. У злёце прымуць удзел камандзіры, камісары і байцы СБА нашага універсітэта. Трэці працоўны семестр-77 стаў для іх сапраўднай школай жыцця.**

(Чытайце 3-ю старонку).



## Выхоўваць імкненне да новага

**«Камсамольскі пражэктар» — масавая форма ўдзелу камсамольцаў і моладзі ў грамадскім кантролі — займае важнае месца ў рабоце камсамола па камуністычнаму выхаванню маладога пакалення», — гэта словы з палажэння аб «Камсамольскім пражэктары» БДУ імя У. І. Леніна. Іх правільнасць, жыццёвасць пацвярджаецца прыкладам дзейнасці «КП» на факультэце прыкладной матэматыкі. «Пражэктар» ФПМ займае другое месца сярод «КП» універсітэта. Арганізатарам яго работы ўжо другі год з'яўляецца студэнт IV курса Павел ЯКАЎЛЕЎ. Яго мы і папрасілі адказаць на некалькі пытанняў, што датычаць дзейнасці «КП» факультэта.**

**— Раскажыце, калі ласка, як часта выходзяць нумары «КП»? Дзе і як вы шукаеце тэмы для выступленняў?**

— У сярэднім у месяц выходзіць не менш двух асноўных нумароў «Пражэктара». Акрамя таго, у залежнасці ад акалічнасцей, выпускаюцца «маланкі», «баявыя лісткі», «вокны «КП». А тэмы для выступленняў — гэта не праблема. Трэба толькі пільней прыглядзецца, і яны звернуць на сябе ўвагу: гэта вечны натоўп у вестыбюлі, «шэдэўры», намаляваныя на сталах у аўдыторыях, наведванне заняткаў студэнтамі і паспяховасць у вучобе, якая знаходзіцца ў прамой залежнасці ад наведвання.

**— Ці лічыце вы, што «КП» павінен адлюстроўваць толькі дрэнныя бакі студэнцкага жыцця?**

— Зусім не. Вядома, дрэннае ёсць, і з ім трэба змагацца. І ўсё ж лепшага ў жыцці больш. Таму наш «пражэктар» не прамінае адлюстраваць падрыхтоўку і ход працоўных дэсантаў, вынікі агляду мастацкай самадзейнасці факультэта, ход грамадска-палітычнай атэстацыі, дзе найбольш ярка праяўляецца актыўнасць, свядомасць нашых камсамольцаў.

**— І ўсё ж, у чым вы бачыце галоўную задачу дзейнасці вашага «КП»?**

— Задача вынікае з таго ж палажэння аб «Камсамольскім пражэктары» БДУ імя У. І. Леніна — «развіваць у юнакоў і дзяўчат грамадскую актыўнасць, выхоўваць прынцыповасць, імкненне да новага, пачуццё асабістай адказнасці за справы універсітэта, факультэта, групы, змагацца за высокую якасць атрымліваемых ведаў».

**— Выступленні, крытыка — гэта дзейсныя сродкі газеты. Але, згадзіцеся, нярэдка здараецца, што газета выступіла, пакрытыкавала, вінаватыя пагаварылі аб гэтым... І ўсё засталося па-ранейшаму. Як праяўляецца дзейснасць вашых выступленняў?**

— Прыемна бачыць вынікі сваёй працы, ведаць, што крытыка не прайшла дарма. Доўгі час у нас дрэнна была наладжана работа ў вестыбюлі: там заўсёды чарга, студэнты з-за гэтага спазняліся на заняткі, многія прыносілі свае паліто ў аўдыторыю. За справу ўзяўся «КП». У «папулярнай» форме пракаменціравалі факт і параілі новую форму работы. Зараз у вестыбюлі наладжан парадак, зніклі бясконцыя чэргі.

У студэнцкім інтэрнаце мы працуем разам са студсаветам. Праводзім праверкі стану пакояў, двойчы аб адным і тым жа гаварыць не прыходзіцца — па выніках рэйдаў меры прымаюцца хутка.

**— І апошняе пытанне: як вы самі ставіцеся да месца, якое займае ваш «КП» ва універсітэце? Ці лічыце, што дасягнулі ўжо ўсяго магчымага?**

— Баюся, што адказ здасца занадта шаблонным, але я лічу ўзровень нашага «КП» яшчэ недастаткова высокім. Нам шмат трэба працаваць і многага дасягнуць.

**Д. БЫКАВА.**

СЕСІЯ — СЕСІЯ

# Твой таварыш



Набліжаецца чарговая студэнцкая сесія. Незалежна ад таго, якая яна па ліку — першая ці апошняя, — кожны марыць здаць яе паспяхова. Для таго, каб добра здаць экзамены, патрэбна шмат настойлівасці, цярпення і, галоўнае, трэба мець трывалыя, грунтоўныя веды...

Зусім нядаўна мы пазнаёміліся са студэнткай II курса філалагічнага факультэта Ленай Кавалёвай. Лена — выдатніца вучобы. Гэта сціплая дзяўчына на першы погляд нічым не адрозніваецца ад іншых студэнтаў. Але, пазнаёміўшыся з ёю, мы здзівіліся яе прастаце, энергічнасці.

Лена скончыла спецыялізаваную матэматычную школу. Калі заходзіла размова аб выбары прафесіі, усе аднадушна раілі ісці на матэматычны факультэт. Але яшчэ з дзяцінства Лена захаплялася літаратурай, паэзіяй, магла бясконца чытаць творы Пушкіна, Ясеніна, Талстога. Адным словам, любоў да літаратуры ўзяла верх: яна паступіла на філфак. З першых дзён вучобы Лена сур'ёзна ўзялася за працу.

— Лена, што дапамагае табе добра вучыцца?

— Вялікае значэнне мае школьная падрыхтоўка. Калі ў цябе ў школе склаліся сур'ёзныя адносіны да вучобы, то і ва універсітэце лягчэй. Часта прыходзіцца сядзець часамі над кнігамі, каб выканаць тое ці іншае заданне. Для гэтага неабходна многа цярпення, вытрымкі, настойлівасці.

Лена з'яўляецца членам камітэта камсамола універсітэта і факультэта, адказвае за правядзенне вечароў сустрэч і іншых мерапрыемстваў.

— Ці не перашкаджае гэта вучобе?

— Грамадская работа займае адно з галоўных месц у студэнцкім жыцці, — гаворыць Лена. — Ды і жыць, здаецца, нецікава, калі, акрамя вучобы, нічога не бачыш. Трэба сказаць, гэта работа мне падабаецца. І калі мерапрыемства праходзіць цікава, усе ім задаволены, хочацца працаваць яшчэ лепш, з большай адказнасцю. А вучобе гэта зусім не перашкаджае. Грамадская работа, наадварот, робіць чалавека сабраным, дысцыплінаваным, абавязвае карысна выкарыстоўваць кожную хвіліну.

— Нядаўна да вас на факультэт прыйшло новае папаўненне — першакурснікі. Іх чакае цяжкае выпрабаванне — першая сесія. Што б вы хацелі пажадаць ім?

— Безумоўна, першая сесія — гэта адказны час у жыцці кожнага першакурсніка. І вядома, колькі тут хваляванняў. Таму мне хочацца пажадаць ім настойлівасці, цярпення, добрага настрою і поспехаў.

З. МІХНЕВІЧ,
І. БУДЗЬКО.

## Залежыць ад цябе

**Хутка пачнецца зімовая сесія. Яна будзе асабліва цяжкай для першакурснікаў — першыя экзамены, новыя ўражанні і незнаёмыя раней адчуванні. Аб гэтым з табой, першакурснік, размаўляе студэнтка IV курса гістарычнага факультэта Людміла Лютко.**

— Я лічу, што галоўнае ў вучобе — выпрацаваць сістэму ў пазнанні. Так я і пачынала. Цяжкасці, перашкоды, сумненні — ўсё гэта было. Але без іх немагчымы ўсякі рух наперад. Лёгка бывае толькі ў казцы, а вучоба — гэта карпатлівая, пастаянная праца. Іменна пастаянная. Не трэба адкладваць на потым тое, што можна зрабіць сёння. Матэрыял, схоплены за некалькі дзён перад экзаменам, — бессістэмны, веды — нетрывалыя. І пасля здачы сесіі, як правіла, усё «выветрываецца».

Зімовая сесія ў першакурснікаў — рашаючая. Ад яе залежыць настрой студэнта ў будучым. Таму цяпер, як ніколі, трэба старанна рыхтавацца да семінарскіх заняткаў, своечасова высвятляць незразумелае, паўтараць пройдзены матэрыял. Тады і вынік будзе выдатным. Я жадаю ўсім першакурснікам «шчаслівых» білетаў. Хай ваша першая сесія будзе прыемнай.

Запісала Г. МАЛАХОЎСКАЯ.

# ВОПЫТАМ ДЗЕЛІЦЦА ГІСТФАК

Бадай, няма ва універсітэце другога факультэта, як гістарычны, дзе б ваенна-патрыятычнаму выхаванню аддавалася такая вялікая ўвага. Тут створана школа арганізатараў ваенна-патрыятычнага выхавання. У студэнцкіх навуковых гуртках факультэта студэнты рыхтуюць даклады, пішуць рэфераты па ваенна-патрыятычнай тэматыцы, вывучаюць гераічную гісторыю Вялікай Айчыннай вайны. Штогод праводзіцца красавіцкая Ленінская канферэнцыя, метадычныя і тэарэтычныя канферэнцыі па праблемах інтэрнацыянальнага выхавання, семінары, прысвечаныя юбілейным датам сацыялістычных краін, дзеячам міжнароднага рабочага руху, важным міжнародным падзеям. Прычым у многіх з гэтых мерапрыемстваў прымаюць удзел прадстаўнікі іншых ВНУ краіны, а таксама студэнты з Балгарыі, Польшчы, ГДР.

Немалое значэнне ў справе ваенна-патрыятычнай работы набылі заняткі ў музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, Доме-музеі I з'езда РСДРП, Дзяржаўным музеі БССР. У музеях неаднаразова праводзіліся сустрэчы з ветэранамі Вялікай Айчыннай вайны. На адной з такіх сустрэч студэнты з вялікай цікавасцю слухалі былога камандзіра партызанскага аб'яднання, сакратара падпольнага абкома партыі Р. Н. Мачульскага, які расказаў аб гераічнай барацьбе беларускіх партызан у тыле ворага ў гады акупацыі. Вялікую цікавасць студэнтаў выклікала сустрэча з Героем Савецкага Саюза М. Я. Зайцавым. Лётчык-штурмавік, камандзір звяна, М. Я. Зайцаў зрабіў 185 баявых вылетаў, удзельнічаў у вызваленні Украіны, Польшчы, Чэхаславакіі.

Значную дапамогу ў арганізацыі такіх сустрэч аказваюць прафесар Г. М. Трухноў, намеснік дэкана факультэта М. К. Мазурэнка, дацэнт А. І. Кажушкоў, дацэнт І. В. Марчанка.

Працэс ваенна-патрыятычнага выхавання студэнтаў адбываецца ў цеснай сувязі з інтэрнацыянальным выхаваннем. На факультэце ёсць камітэты савецка-балгарскай, савецка-польскай, савецка-германскай дружбы. Кожны год студэнты гістфака ў саставе інтэрнацыянальнага будатрада выязджаюць за межы краіны.

Знамянальна тое, што многія студэнты пішуць свае дыпломныя работы на патрыятычныя і міжнародныя тэмы: «Савецка-фінляндскія адносіны», «Узаемаадносіны СССР з сацыялістычнымі і капіталістычнымі краінамі», «Вывучэнне вопыту будаўніцтва сацыялізму, міжнароднага камуністычнага і рабочага руху», а таксама на тэму інтэрнацыянальнага руху партызан у гады вайны, удзел савецкіх грамадзян у руху Супраціўлення еўрапейскіх краін, у вызваленні Еўропы ад фашызму.

— Мы рыхтуем не толькі выкладчыкаў сярэдніх школ, але і арганізатараў ваенна-патрыятычнай работы, — гаворыць кандыдат гістарычных навук Л. А. Міхайлоўскі. — Той комплекс мерапрыемстваў, якія мы праводзім са студэнтамі, павінен выхоўваць у іх марксісцка-ленінскі светапогляд, дапамагчы ім засвоіць марксізм як творчасць, а не як догму, каб яны самі з пункту гледжання марксісцкай метадалогіі маглі ацэньваць падзеі. Выхаванне марксісцка-ленінскага светапогляду — гэта не самамэта. Студэнт павінен перадаць свае веды іншым, каб іншыя змаглі перадаць наступным.

Л. ВАНЮШКІНА.

# МОЙ ДОМ — ІНТЭРНАТ...

У студэнцкім інтэрнаце № 6 пражываюць больш як 650 чалавек. Розныя характары, імкненні, захапленні... Але, нягледзячы на гэта, у жыхароў шмат агульнага. Студэнты ФПМ знайшлі ў інтэрнаце родны дом, цяпер яны — адна дружная сям'я. «Бацькоўскімі» правамі карыстаецца студсавет. Задачы яго, прама скажам, складаныя. План работы пачынаецца са слоў «наладзіць», «арганізаваць». Наладзіць быт, арганізаваць адпачынак, «пазааўдыторнае» жыццё студэнтаў. Наколькі гэта ўдаецца, спытаем у студэнтаў.

**Казлоў Аляксандр:** — Лічу, што быт у многім залежыць ад нас саміх. Для яго добрай арганізацыі ў інтэрнаце ёсць усе ўмовы. І гэтыя ўмовы студсавет умее выкарыстоўваць. Кожную пятніцу гучыць сваё «інтэрнацкае» радыё, што ўсім да спадобы — і пра апошнія факультэцкія навіны даведаешся, і пачуеш любімую музыку.

**Фрэнкін Яўген:** — Зразумела, ёсць у нас свае «маленькія трагедыі» — то ліфт сапсуецца, то перабоі з вадой. Але гэта дробязі, яны хутка забываюцца. Затое доўга помняцца ўсім вечары, сустрэчы, дыскатэкі, дыспуты...

**Пацыенка Наталля:** — Я жыву ў інтэрнаце ўсяго тры месяцы. Тут мне вельмі падабаецца. Кожную суботу — вечары адпачынку, лекцыі, танцы, цікавыя сустрэчы. Мне запомніліся знаёмствы з музычным клубам «Красавік-77», турыстамі ФПМ.

Як бачна, студсавет разумее ўсю адказнасць «бацькоўства». У прафкоме БДУ інтэрнат № 6 лічаць адным з лепшых. Яго неаднаразова прызнавалі пераможцам у сацыялістычным спаборніцтве, адзначалі добрую работу студсавета.

Слова старшыні студсавета **Мікалаю Губанаву.**

— Сваю работу мы пачыналі з вечара пытанняў і адказаў. Мэта — даведацца, чаго чакаюць студэнты ад студсавета, як яны хацелі б праводзіць свой вольны час. Прапановы, пажаданні ляглі ў аснову плана нашай дзейнасці. У гэтым годзе стабілізавалася работа інтэрнацкага радыёвузла, устаноўлен пастаянны час радыёперадач. У адной з чытальных залаў створан Ленінскі пакой, там заўсёды свежыя газеты, часопісы. Рыхтуем стэнд, які раскажа аб жыцці студэнтаў у інтэрнаце, збіраем матэрыялы, фотаздымкі. Дарэчы, для аматараў фатаграфіі ў нас існуе фоталабараторыя. Традыцыйныя суботнія вечары адпачынку мы імкнемся рабіць разнастайнымі па тэматыцы, запрашаем на іх, наколькі гэта магчыма, цікавых людзей. Думаю, не памылюся, калі скажу, што сустрэчы з факультэцкім музычным клубам «Красавік-77», з турыстамі ФПМ спадабаліся ўсім прысутным. Многа добрых ідэй у нас наконт карыснага, змястоўнага адпачынку. Мяркуем арганізаваць сустрэчу з артыстамі рускага драматычнага тэатра імя М. Горкага.

А. ЦЯРЭНЦЬЕВА.

# Якога ўзросту Цянь-Шань?

Раніца. 8.20. Шумна, мнагалюдна ў гэты час на калідорах геафака. Каля расклада — натоўп. Званок! Калідоры ў імгненне пусцеюць. Пачынаюцца заняткі.

Давайце асцярожна прыадчынім дзверы і зазірнем у адну з аудыторый. На дошцы вісяць схемы ціску паветра, здзіўленымі сінімі вачыма глядзяць з карты паўшар'і. Цішэй! Ідуць практычныя заняткі па глебазнаўству ў першай групе I курса геафака.

— Якая платформа ляжыць у аснаванні Паўднёвай Амерыкі?

— Бразільская.

— Назавіце барычаскія мінімумы паўночнага паўшар'я.

Адказ. Пытанне. Адказ. Такое ўражанне, нібыта разам з Магеланам робіш падарожжа вакол свету. Хочацца памарыць.

Час ляціць вельмі хутка. Вось і перапынак. Цяпер задаю пытанні я.

— Чаму вы выбралі іменна геаграфічны факультэт?

Іра Ляпешка:

— Памятаю, у школе мяне абураў Мітрафанушка з камедыі Фанвізіна «Недарастак», які сцвярджаў, што геаграфію неабавязкова ведаць, раз ёсць рамізнікі. А геаграфія — гэта здарова, гэта цэлы свет, цікавы і разнастайны.

Аляксей Дабрэга:

— Геаграфію я проста люблю.

Наташа Смалянка:

— Яшчэ з восьмага класа я марыла стаць падарожніцай. Цяпер я ведаю, што геаграфія — гэта самае цікавае падарожжа.

Заняткі працягваюцца. Шамацяць лісткі міліметроўкі, блішчаць цыркулі. Рабяты малююць гіпсаметрычны профіль дна акіяна. Строгі выкладчык Лілія Уладзіміраўна Мар'іна добрай думкі аб першакурсніках:

— Група знаходлівая, цікаўная, але самае галоўнае — працавітая.

10.05. Глебазнаўства закончылася. Рабят чакаюць новыя заняткі, новыя пытанні і адказы.

Наперадзе — працяг захапляючага падарожжа ў краіну Геафакію.

В. КОЗЕЛ.

# Яе сябры — кнігі

**Кожны дзень ты сустракаешся з кнігай, уваходзіш у цудоўны свет яе герояў. Але не заўсёды заўважаеш тых людзей, хто паставіў кнігу на паліцу, хто дапамог табе адшукаць патрэбную літаратуру, хто штодзённа нясе сваю нялёгкую вахту ў бібліятэцы.**

**Я хачу расказаць аб чалавеку, які амаль ужо 30 гадоў свайго жыцця прысвяціў прафесіі бібліятэкара. Гэта загадчыца даведачна-бібліяграфічнага аддзела бібліятэкі нашага універсітэта Зінаіда Іосіфаўна Рахманчык.**

**...Жанчына сустрэла мяне лагоднай усмешкай. Навокал яе стаялі шкафы, а ў іх — тайна кожнай кнігі.**

**Працаваць у бібліятэку універсітэта З. І. Рахманчык прыйшла яшчэ ў 1954 годзе. Яна з'явілася заснавальнікам даведачна-бібліяграфічнага аддзела — ДБА. Штодзённа ў гэты аддзел звяртаецца больш 100 чалавек, а бывае і 180—190. Кожнаму патрэбна дапамагчы ў выбары літаратуры, даць адпаведныя даведкі аб кнізе. Калі можна так сказаць, ДБА — мозг бібліятэкі.**

**— У яе не можа атрымлівацца інакш. Такі яна чалавек: добрасумленны, працавіты, шчыры. Асноўны сэнс сваёй працы бачыць у тым, каб дапамагчы чытачу, каб зберагчы яго час, — гаворыць калега Зінаіды Іосіфаўны, галоўны бібліёграф Е. Дукор.**

**Сапраўды, гэта так. З 1958 года Зінаіда Іосіфаўна пачала праводзіць заняткі па бібліяграфіі на філалагічным факультэце БДУ. Яна вучыла гэтай справе іншых работнікаў бібліятэкі. Цяпер на кожным факультэце, у кожнай групе праводзяцца заняткі па бібліяграфіі. Студэнтаў навучаюць методыцы падбору літаратуры, афармленню абанементаў і г. д.**

**З. І. Рахманчык была старшынёй метадычнага савета бібліятэкі.**

**Я папрасіў Зінаіду Іосіфаўну расказаць аб сваёй рабоце.**

**— Звычайная работа. Абслугоўваем шырокае кола чытачоў — ад студэнтаў да супрацоўнікаў. Наша бібліятэка — цэнтр метадычнай работы ўсіх бібліятэк ВНУ рэспублікі. Да нас звяртаюцца з ДБА гэтых бібліятэк за кансультацыяй па даведачна-бібліяграфічных пытаннях.**

**За сваю шматгадовую плённую працу Зінаіда Іосіфаўна неаднаразова ўзнагароджвалася. Яна — ударнік камуністычнай працы.**

**— У чым Вы бачыце радасць сваёй працы? — спытаў я Зінаіду Іосіфаўну.**

**— Усведамленне таго, што дапамагаеш людзям, — вось галоўная радасць маёй працы.**

**В. ЧАРНУШЭНКА,**
**студэнт II курса журфака.**






# ДОЎГА БУДЗЕ МАЛДАВІЯ СНІЦЦА...

**У АТРАДЗЕ АДНЫ ДЗЯЎЧАТЫ**

У самым прыгожым месцы сяла Крэменчуг, у дубовым гаі, стаяць два домікі. На адным з іх вісіць вялікі плакат: «Калі ласка, у царства Феміды!» Феміда —старажытнагрэчаская багіня мудрасці і правасуддзя. Не выпадкова назвалі так сваё жыллё байцы СБА імя Сакаловай. Бо асноўны састаў атрада — студэнткі юрыдычнага факультэта.

Справядлівасць — асноўны закон нашай камуны. Усіх нас 55—вясёлых, жыццярадасных, загарэлых. 56-м ганаровым байцом мы залічылі былога выкладчыка кафедры крымінальнага вышуку Мінскага юрыдычнага інстытута Сакалову, якая геройчна загінула ў гестапа.

Атрад імя Сакаловай — адзіны ў зводным СБА, дзе толькі дзяўчаты. Але гэта зусім не перашкаджала справе. Нават зайздросцілі многія рабяты нашым поспехам у працы, спорце, мастацкай самадзейнасці.

**НЕ ТОЛЬКІ РАМАНТЫКА**

Працавалі мы на ўраджайных палях саўгаса «Малдавія» Слабадзейскага раёна, дапамагалі ва ўборцы гародніны. Адразу ж хачу рассеяць памылковыя думкі некаторых студэнтаў, якія лічаць, што працаваць у Малдавіі вельмі лёгка; іншая справа — тайга ці тундра. Так могуць гаварыць толькі тыя, хто ніколі не працаваў у Малдавіі, каму незнаёмы салёны прысмак вінаграду. Я ўпэўнена, што не кожны «скептык» вытрымаў бы «малдаўскі семестр». А былі ж у нас і такія. Проста з'язджалі дадому.

...Вялікія жоўтыя кабачкі лянiва грэліся пад праменнямі гарачага малдаўскага сонца. Зялёнае калючае лісце царапала рукі, ногі, а вялікія кашы з кожнай гадзінай станавіліся ўсё цяжэй. Жара, як звычайна, 33—35 градусаў. Згадзіцеся, нялёгка беларусам акліматызавацца. Часам пот заліваў вочы, тонкімі струменьчыкамі збягаў па нагах. Былі і звычайныя недахопы: то няма тары, то ў час не пададуць ваду. Наш камандзір Таня Каралёва прыкладала шмат намаганняў, каб мы працавалі без прастояў. І мы працавалі. Штодзённа выконвалі норму на 120—140 працэнтаў.

А ўвечары, як толькі згушчаліся над шумным Днястром першыя прыцемкі, разам з атрадам БПІ «Юнацтва» мы збіраліся ля кастра і пад ціхі перабор гітары зацягвалі сваю любімую песню «А ўсё канчаецца...».

Зоркі здзіўлена глядзелі на сваё адлюстраванне ў вадзе. Раптам адна не ўтрымалася і вогненнай стралой паімчалася ўніз, за ёю — другая, трэцяя...

— Зоркапад! Зоркапад!— крычалі мы, і кожны ў гэтае імгненне верыў у сваю зорку.

А раніцай нас зноў чакала поле — мора жоўтых кабачкоў...

**ШТО МЫ НАБЫЛІ**

Аднойчы я спытала ў Тані Каралёвай, ці задаволена яна атрадам.

— Калі прызнацца сумленна, у пачатку семестра я крыху баялася. Баялася, ці заўсёды будуць разумець мяне дзяўчаты. Бо ўсе яны такія розныя, з розных курсаў, патокаў, нават факультэтаў. Але цяпер з упэўненасцю магу сказаць: калектыў адбыўся.

Калектыў адбыўся... Гэта, бадай, самае галоўнае — пакінуць добрую памяць аб сабе і ўвезці дружбу, народжаную ў працы.

...Звычайны працоўны дзень. Сонца пякло, як заўсёды, бязлітасна. Раптам надвор'е змянілася — пайшоў дождж. Малдаўскі лівень. Але ніхто не пакінуў поля, калі нам паведамілі, што патрэбна дагрузіць машыну кабачкамі. Чарназёмная зямля хутка размокла, і мы з цяжкасцю перасоўваліся. Мокрыя, брудныя, перакідвалі цяжкія кабачкі, усміхаючыся і падбадзёрваючы адзін аднаго. А любы з нас мог бы пайсці — была каманда застацца толькі жадаючым. Засталіся ўсе.

**ЭПІЛОГ**

Нам было сумна развітвацца з месцамі, якія пакінулі след у душы кожнага, дзе мы даведаліся аб сапраўдным кошце банкі кабачковай ікры і — кошце дружбы.

І якім было наша здзіўленне, калі перад ад'ездам мы раптам убачылі чараду белых птушак. Яны ляцелі высока ў небе, развітальна махаючы крыламі. Гэта былі буслы. І мне здалося раптам, што ў клюве аднаго з іх я ўбачыла гронку вінаграду...

**Т. БЯЛІЦКАЯ,**
студэнтка факультэта журналістыкі.

...Летняя раніца. Першыя праменні ласкавага сонца скальзяць па зямлі, па фігурах юнакоў і дзяўчат у зялёнай форме СБА, якія роўнай шарэнгай выстраіліся перад мачтай з чырвоным сцягам.

У СБА «Радзімічы» свята — дзень дзяўчат. Рабяты пастараліся зрабіць усё, каб гэты дзень запомніўся лепшай палове атрада надоўга. Шчаслівым і папрыгажэўшым дзяўчатам прадастаўляецца ганаровае права падняць сцяг атрада. Сёння дзяўчаты не працуюць на кухні. Хлопцы-кухары стараюцца не ўдарыць тварам у гразь. Перад імі нялёгкая задача: падрыхтаваць святочную вячэру.

У «кафэ» «Радзімічка» ўжо ўсё гатова. Рабяты выстройваюцца ля ўваходу, уручаюць дзяўчатам кветкі і сувеніры. Гучаць песні, смех, жарты...

# 55 дзён «Радзімічаў»

Атрад «Радзімічы» II курса юрыдычнага факультэта будаваў на Пскоўшчыне школу ў пасёлку Падбярэззе. Гэта будоўля была абвешчана камсамольскай ударнай. Пяцьдзесят пяць дзён працавалі тут студэнты. Са сваёй задачай атрад справіўся на «выдатна». Замест планавых 6000 рублёў ён асвоіў 9000 рублёў капіталаўкладанняў.

Многа цудоўных успамінаў засталося ў байцоў атрада аб працоўных днях, праведзеных у Падбярэззі. Не забываюць беларускіх рабят і мясцовыя жыхары. Да гэтае пары атрымліваюць студэнты пісьмы з Пскоўшчыны. Яны падтрымліваюць цесныя сувязі з праўленнем саўгаса і райкомам камсамола.

«Радзімічы»... Касцяк атрада склаўся яшчэ на «бульбе» мінулага года. А за год вучобы рабяты і дзяўчаты пасябравалі, многа даведаліся адзін пра аднаго. Камандзірам атрада стаў камуніст Аляксандр Чыкалёў, камісарам — Мікалай Жэчко. Ужо ў падрыхтоўчы перыяд байцы авалодалі будаўнічымі спецыяльнасцямі, прачыталі шэраг лекцый у школах і на прадпрыемствах Мінска, выступілі з канцэртамі і ў выніку занялі першае месца на факультэце. Веды, атрыманыя ў падрыхтоўчы перыяд, рабяты з поспехам прымянілі ў час трэцяга працоўнага семестра.

«Радзімічам» было вельмі цікава пазнаёміцца з гісторыяй Пскоўскага краю. Успаміны аб Пскове можна сустрэць у першых рускіх летапісах. Шмат чаго бачыла на сваім вяку гэта зямля: і нашэсце нямецкіх рыцараў, і пару Івана Грознага.

У гады Вялікай Айчыннай вайны непадалёку ад Падбярэззя, ля вёскі Чарнушкі, здзейсніў свой легендарны подзвіг Аляксандр Матросаў. Байцы СБА сустракаліся з відавочцамі падзей, гутарылі з людзьмі. «Радзімічы» прывялі ў парадак брацкую магілу савецкіх воінаў, якія загінулі ў баях за Радзіму, штодзень прыносілі сюды кветкі.

— Атрад у нас падабраўся дружны, зладжаны, — гаворыць Аляксандр Чыкалёў.— Часам не хапала будматэрыялаў, аўтамашын, але, нягледзячы на гэта, са сваёй задачай мы справіліся паспяхова.

Атрад узнагароджан дзесяццю граматамі, у тым ліку граматамі Пскоўскага абкома і райкома камсамола, абласнога штаба СБА, камітэта камсамола БДУ. Амаль усе байцы маюць асабістыя ўзнагароды.

**А. ДЫННІКАЎ.**

# Вечар працоўнай славы

Асвоена 837 тысяч рублёў капіталаўкладанняў, перад працоўнымі Беларусі, Карэліі, Малдавіі, Нечарназем'я і будаўнікамі Байкала-Амурскай магістралі прачытана 120 лекцый, дадзена 95 канцэртаў — такі вынік удзелу студэнтаў гістарычнага факультэта ў трэцім працоўным семестры гэтага года. Ва ўсіх атрадах прайшлі сходы, на якіх абмяркоўваўся праект новай Канстытуцыі СССР, дзейнічалі піянерскія лагеры-спадарожнікі, аказана вялікая шэфская дапамога школам. Сярод лепшых СБА універсітэта — атрады «Кастрычнік» і імя Чэ Гевары.

Ужо сёння штабам працоўных спраў і камітэтам камсамола гістфака распачалася падрыхтоўка да працоўнага семестра-78, які будзе прысвечан 60-годдзю ВЛКСМ і 20-годдзю ўсесаюзнага студэнцкага будаўнічага руху.

Аб гэтым гаварылася на вечары працоўнай славы гістарычнага факультэта, які адбыўся 10 снежня ў памяшканні клуба імя Ф. Э. Дзяржынскага. Перад студэнтамі факультэта і шматлікімі гасцямі выступілі намеснік сакратара камітэта камсамола БДУ В. Левашэвіч, камандзір штаба працоўных спраў гістфака Г. Храпко, камандзір СБА «Кастрычнік» А. Скікевіч, намеснік дэкана факультэта.

Лепшым студэнтам-будаўнікам былі ўручаны ганаровыя граматы.

Прысутныя змаглі ўбачыць канцэрт, складзены з лепшых нумароў атрадных агітбрыгад, і дакументальны фільм аб рабоце байцоў СБА «Кастрычнік». Кінастужка знята аператарамі Беларускага тэлебачання на пскоўскай зямлі. Быў паказан таксама аматарскі кінафільм, зняты байцом атрада «Кастрычнік» А. Аладзьіным.

Вечары працоўнай славы сталі добрай традыцыяй амаль на ўсіх факультэтах БДУ.

**А. ДУБРАВІН.**



# Новыя справы «Кастрычніка»

Працоўны семестр даўно закончан. Але не распаўся будатрад гістарычнага факультэта «Кастрычнік». За два гарачыя працоўныя месяцы рабяты здорава пасябравалі, з'ядналіся ў адзін калектыў. Зараз яны першыя ва універсітэце на сваім агульным сходзе зацвердзілі план работы ў новым падрыхтоўчым перыядзе. Рыхтуюцца матэрыялы для радыёгазет і насценнага друку. Працягваюць сваю работу лектарская група і агітбрыгада атрада.

Нядаўна байцы СБА «Кастрычнік» былі гасцямі Палаца піянераў, прымалі ўдзел у вусным часопісе «Радзіма». Камандзір атрада А. Скікевіч, камісар Г. Храпко расказалі піянерам аб цяжкіх, але цікавых буднях працоўнага лета, аб экскурсіі атрада на радзіму А. С. Пушкіна. Сваімі ўспамінамі падзяліўся ветэран студэнцкага будаўнічага руху М. Аўраменка, які пабываў на ўдарных будоўлях Беларусі, Нечарназем'я, Заходняй Сібіры. Цёпла сустрэлі школьнікі выступленне атраднай агітбрыгады. Піянеры ўручылі студэнтам падарункі, зробленыя сваімі рукамі.

Наперадзе байцоў СБА «Кастрычнік» чакае яшчэ нямала цікавых спраў.

**А. АЛЯКСЕЕВА.**

# ВОБРАЗ СУЧАСНІКА І СУЧАСНАСЦІ

У Доме мастака праходзіла выстаўка маладых жывапісцаў рэспублікі. Перш за ўсё прыцягвалі ўвагу работы, прысвечаныя нашаму сучасніку. «Аўтапартрэты» Я. Куліна, «Партрэт студэнткі» В. Самсонава і іншыя творы адлюстроўвалі найбольш адметныя рысы юнацтва краіны. Героі карцін— розныя, зусім не падобныя адзін на аднога, але як добра адчуваецца іх унутранае падабенства. Перад намі вырысоўваецца вобраз нашага маладога сучасніка, энергічнага, упэўненага ў сваім будучым чалавека, прагнучага шчасця ўсяму чалавецтву.

В. Ціханаў. «Успаміны». На палатне — старая жанчына. Белая сукенка, белыя кветкі каля ног. Белыя, спакойныя фарбы... Спакойны жаночы твар, вакол цішыня, толькі ў вачах затоены жаль і смутак. З болем у сэрцы наплываюць успаміны жанчыны-маці, жанчыны-гераіні. Гэта яна праводзіла сваіх сыноў на смяротны бой з фашызмам, гэта яна, атрымаўшы звестку аб гібелі мужа, працавала па 12 гадзін ля станка, выносіла пад кулямі параненых з поля бою. Яна выстаяла ў ліхую гадзіну выпрабаванняў. У вачах яе так назаўсёды і засталася нянавісць да вайны, да гэтай самай страшнай бяды чалавецтва.

Многа работ было прысвечана прыродзе Беларусі, памятным месцам рэспублікі. Творы «Лясное возера» Я. Куліна, «Родныя мясціны» М. Ісаенкі яшчэ раз уразілі непаўторнасцю беларускіх пейзажаў.

Дапамагчы чалавеку як бы занава ўбачыць свет, паказаць яму штосьці невядомае, выхоўваць у ім дабрату, веру ў людзей — такой была мэта выстаўкі ў Доме мастака.

**І. ІВАНОЎ.**

# ТОЛЬКІ АДЗІН ДЗЕНЬ

У кожнага чалавека кантакт з прыродай, з жывым і рэальным выклікае пачуццё далучэння да ўжо накопленых ведаў і дае адчуванне пранікнення ў сутнасць рэчаў.

Дні беларускай восені... Яны па-свойму прыгожыя: мяккі ветрык, шапаценне апалага лісця і тонкі водар лесу, які рыхтуецца да зімы.

У адзін з такіх асенніх дзён мы, група студэнтаў геафака, наведалі родныя мясціны Ф. Э. Дзяржынскага.

Невялікі музей у г. п. Івянцы, дзе з такой любоўю і стараннасцю падабраны экспанаты, уразіў нас. Ад залы да залы —і перад намі прайшло жыццё чалавека, што аддаў справе рэвалюцыі ўсе свае сілы. Рэчы, дакументы характарызуюць яго без слоў: сціплы, просты, стойкі, загартаваны.

Пасля мы былі ў маёнтку, дзе нарадзіўся гэты чалавек. У час вайны фашысты па-варварску знішчылі ўсе будынкі, але працаўнікі музея, як маглі, аднавілі маёнтак. І тут мы ўбачылі шмат новага і цікавага.

Гэты асенні дзень, далучэнне да таго, чым жыў калісьці Дзяржынскі, пакінулі ў нашых сэрцах незабыўнае ўражанне.

**Г. МЕНДЗЯЛЕЕЎ,**
**студэнт геафака.**

# Фантазіі лясных «скульптараў»



«Прырода і фантазія» — так называецца дзевятая гарадская выстаўка, якая праходзіць з 4 па 27 снежня ў Доме афіцэраў. На ёй прадстаўлена звыш 300 экспанатаў лясной скульптуры і мастацкай кампазіцыі з прыродных матэрыялаў. Выстаўка арганізавана секцыяй «Прырода і творчасць», якая пяты год існуе пры Беларускім таварыстве аховы прыроды.



Людзі розных узростаў і прафесій — удзельнікі выстаўкі — у вольны час ствараюць арыгінальныя скульптуры з дрэва. У якасці матэрыялу — карэнні, галінкі, часткі ствалоў аджыўшых свой век дрэў, разнастайныя формы нарасці на іх і іншыя прыродныя ўтварэнні. У іх пільныя вочы лясных «скульптараў» часам знаходзяць абрысы рэальна існуючых або казачна-фантастычных істот. Кавалкі дрэва ва ўмелых руках ператвараюцца ў сапраўдныя творы мастацтва. Смела ўключаючы прыродныя формы дрэва ў агульны пластычны лад скульптуры, умельцы ствараюць выразныя, запамінальныя творы.

Цэнтральнае месца ў творчасці беларускіх умельцаў займае вобраз чалавека. Непаўторнасцю вее ад работ М. Буланава. Дараванне яго найбольш ярка выяўляецца ў партрэтным жанры. Пачуццё тонкага гумару спалучаецца тут з вострай назіральнасцю, уменнем дакладна прыкмеціць характэрныя рысы таго або іншага персанажа. Так, яго работы «Мой любімы стары дзед» і серыя «Дзяды» — гэта цікавыя мастацкія вобразы. Твары, усеяныя маршчынамі, прыплюснутыя насы, цвёрдыя лініі губ і ўважлівы насцярожаны позірк — так расказвае аўтар пра сваіх герояў. Цікавыя таксама яго работы «Танцавальная сюіта» і «Амерыка сёння».

Некаторыя аўтары аддаюць перавагу анімалістычнаму жанру. Створаныя імі птушкі і звяры жывуць у прывычных для іх абставінах, заняты сваімі штодзённымі справамі. У гэтым плане цікавыя скульптуркі «Кракадзіл», «Сава», «Фазан», «Сом».

Тэматыка твораў лясных «скульптараў» незвычайна разнастайная: ад «Аўдоцці Нікіцічны» С. Шыбко да «Какеткі» Л. І. Ізоха, ад «Лебядзінай песні» Л. Жданава да «Сярэбранага капытка» М. Кашкана.

Лясныя «скульптары» прыцягваюць увагу ўнутранай свабодай, раскаванасцю поз і рухаў. У іх далёка не захаваны прынцыпы строгага прытрымлівання анатамічных форм. І ўсё ж давер'е да створанага ад гэтага не памяншаецца.

— Трэба заўважыць, — гаворыць адміністратар выстаўкі Іосіф Паўлавіч Яцанчук, работы якога ўдастоены дыплома І ступені на ВДНГ СССР, — творчае майстэрства нашых умельцаў значна ўзрасло за апошні час. Многія з гэтых работ з'яўляюцца глыбока змястоўнымі творамі. Яны нясуць велізарны эмацыянальны зарад, які здольны выклікаць у гледачоў узвышаныя пачуцці, глыбокія эстэтычныя перажыванні.

**С. ФУРСА.**
Фота **А. Басава.**



# ВАКОЛ СПОРТУ

На мехмаце правядзенне спартыўных вечароў ужо стала традыцыяй. На гэты раз мехматаўцаў чакала прыемная сустрэча з прызёрамі Алімпійскіх гульняў у Манрэале па скачках у ваду Уладзімірам Алейнікавым і Аляксандрам Касянковым. Валодзя і Саша вучацца ў фізкультурным інстытуце, рыхтуюцца да Алімпіяды-80. Спартсмены расказалі пра свае першыя крокі ў плаванні, пра планы на будучыню.

— Спортам я займаюся ўсяго толькі сем гадоў. Ды і ў алімпійскую каманду папаў, лічу, выпадкова. У Манрэалі перада мною стаяла зусім невялікая задача — прынесці камандзе ачкі. Папаў у фінал. Апошні скачок вырашыў усё: я стаў бронзавым прызёрам Алімпійскіх гульняў, — расказвае Уладзімір Алейнікаў.

— А я ніколі не марыў быць спартсменам. Напрыклад, у трэцім класе думаў аб тым, каб перайсці ў чацвёрты, — усміхаецца Саша Касянкоў. — У 1969 годзе маім трэнерам стаў Рабчыкаў. Канешне, не лёгка восем гадзін у дзень аддаваць спорту. Але Алімпійскія гульні ў Манрэалі паказалі, што штодзённая ўпартая праца не прапала дарма.

— Ці страшна скакаць у ваду?

— Страху не адчуваеш. Увесь сабраны, увага сканцэнтравана на выкананні задачы.

— Чым захапляецеся, акрамя спорту?

— Музыкай, чытаннем мастацкай літаратуры.

— Як вы ставіцеся да славы?

— Мы яшчэ не дабіліся вельмі высокіх вынікаў, каб зазнавацца.

Хутка ляцеў час. Студэнты расказвалі гасцям, у сваю чаргу, аб спартыўных поспехах факультэта, назвалі імёны лепшых спартсменаў.

Спартыўны вечар спадабаўся ўсім — студэнтам і іх гасцям. Вось што сказала чацвёртакурсніца мехмата Святлана Атамановіч:

— Пасля такіх вечароў хочацца яшчэ больш і ўпарцей займацца сваім любімым відам спорту. Я, у прыватнасці, абараняю гонар факультэта па спартыўнаму арыентаванню Можа і не дасягну значных поспехаў, але спорт з-за гэтага не стану любіць менш.

**Л. ЯЦЭВІЧ,**
**(Прэс-цэнтр камітэта камсамола).**

# ГЭТЫЯ КАРОТКІЯ ДОЎГІЯ ГАСТРОЛІ

Закончыліся гастролі ў Мінску Маскоўскага мастацкага акадэмічнага тэатра імя М. Горкага. Паслядоўнікі школы Станіслаўскага і Неміровіча-Данчанкі, артысты МХАТа пакінулі незабыўныя ўражанні сваім драматургічным майстэрствам.

Пасля таго, як адшумелі авацыі, адгучалі ўдзячныя прамовы ў адрас вядомага тэатра, я адшукаў у закулісных лабірынтах, дзе масквічы рыхтаваліся да ад'езду, намесніка дырэктара МХАТа Я. А. Новікава з тым, каб задаць яму некалькі пытанняў.

— Гастролі прайшлі паспяхова. І ўсё ж, што Вы можаце сказаць аб іх выніках?

— Тры дні гастроляў, дзве п'есы, несумненна, гэта не магло задаволіць у поўнай меры мінскага гледача і, я прызнаюся, нас таксама. Чаму? Справа вось у чым: паміж Мінскам і МХАТам існуе асаблівая сувязь. Яе карані ўходзяць у 1941 год, калі вайна застала артыстаў тэатра на гастролях тут, у сталіцы Беларусі. Многія работнікі тэатра разам з беларускімі акцёрамі пайшлі тады са сцэны прама на фронт...

З таго часу нас звязвае шчырая, моцная дружба. Гэтым можна растлумачыць вялікае хваляванне, якое мы адчуваем, выступаючы перад мінчанамі, а значыць, нашу асаблівую патрабавальнасць да сваёй работы. У гэтым сэнсе, як я лічу, трупа тэатра пастаўленую перад гастролямі задачу выканала. Але, з другога боку, артыстам хацелася б большага. Думаю, гэта не толькі мае асабістыя ўражанні.

— Яўген Аляксандравіч, у чым прычына такога кароткага візіту да нас у Мінск?

— Усе доўгія гастролі тэатра распісаны на некалькі сезонаў уперад, але бывае, што паміж пунктамі напружанай гастрольнай праграмы атрымліваецца перапынак, які па праву належыць нашым лепшым сябрам — жыхарам Ленінграда, Мінска, Кіева. На гэты раз мы аднадушна выбралі Мінск. Што датычыць працягласці, то, відаць, лепш менш, чым нічога.

— Тэатр паказаў нам сваю навінку, п'есу вядомага малдаўскага драматурга Іона Друцэ «Святая святых». Па сутнасці ў Мінску адбылася яе прэм'ера, так?

— Бясспрэчна. І мы зрабілі гэта наўмысна. Цяпер, калі спектакль паспяхова «здаў» экзамен, можна не сумнявацца ў яго далейшым поспеху. Спадзяемся, што ў хуткім часе ён зойме дастойнае месца ў нашым рэпертуары, як, напрыклад, спектакль па п'есе «Валянцін і Валянціна» М. Рошчына.

— У спісе выканаўцаў дзеючых асоб гэтай п'есы разам з шырока вядомымі імёнамі мы знаходзім імёны А. Кірыліна, А. Проклавай, Б. Дзьячэнкі. Хачу падзяліцца асабістым уражаннем. Калі знаходзішся ў глядзельнай зале і сочыш за ігрой акцёраў, не заўважаеш розніцы ва ўзроўнях сцэнічнага майстэрства, настолькі адпрацаваны, перажыты маладымі артыстамі іх ролі. Што гэта? Вынік шматразовых паўтораў, «пройгрышаў» спектакля?

— Памылкова будзе адказаць і «не» і «так». Зразумела, галоўны рэжысёр тэатра, кіраўнік пастаноўкі народны артыст СССР Алег Яфрэмаў удзяляе выключную ўвагу шліфоўцы, дасканаленню выканаўчага майстэрства ад спектакля да спектакля. Але несумненны і асабістыя акцёрскія якасці нашых маладых артыстаў, іх намаганні па павышэнню свайго мастацкага ўзроўню. Дапамагаюць ім у гэтым гастролі.

— Яўген Аляксандравіч, над чым зараз працуе ваш калектыў?

— Бліжэйшыя планы тэатра — пастаноўка п'ес Фурманава, Гельмана. Мяркуем звярнуцца да класічных твораў рускай і сусветнай драматургіі. Гэта наша даніна мінуламу і ўклад у сучаснае.

— Дзякую. Поспехаў вашаму слаўнаму тэатру!

**Гутарку вёў**
**А. ГРУЗДЗІЛОВІЧ,**
**студэнт журфака.**

Рэдактар А. А. ДЗЕРАШ.

НАШ АДРАС 220080, Мінск-80. Універсітэцкі гарадок, геаграфічны корпус, п. 14. Тэлефон 22-07-19.

АТ 21179 Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КПБ. Заказ № 1962.